Источник: "Літаратура і мастацтва" - 2013-09-13

# Торт для Бібліі



У Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі адкрылася выстаўка, прысвечаная 450-годдзю Брэсцкай Бібліі. Адзначыць юбілей знакамітага выдання сабраліся прадстаўнікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Прэзідэнцкай бібліятэкі краіны, Нацыянальнага гістарычнага архіва Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі ды іншых устаноў.

Сямейная атмасфера дня нараджэння вытрымлівалася ва ўсім. Быў нават торт са свечкамі, і прынёс яго ў залу не хто іншы, як Мікалай Радзівіл Чорны. Зразумела, не той, які 450 гадоў таму ўдзельнічаў у выданні Бібліі, а той, хто цяпер клапоціцца пра фаліянт, — загадчык аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБ НАН Беларусі Аляксандр Сцефановіч. На працягу ўсёй імпрэзы гучалі шчырыя словы пра выключнасць кнігі для Беларусі і Еўропы, згадвалася яе мінулае.

«Нарадзілася» яна 4 верасня 1563 года ў Брэсце і выйшла тыражом больш як 500 экзэмпляраў. Гэтае выданне стала новым этапам у гісторыі еўрапейскага кнігадрукавання. Ініцыятарам стварэння польскамоўнага перакладу Святога Пісання быў канцлер ВКЛ Мікалай Радзівіл Чорны. Пасля яго смерці некаторыя асобнікі (у тым ліку і прадстаўленыя на выстаўцы) трапілі ў Бібліятэку Віленскага евангелісцка-рэфарматарскага сінода. На радзіму Біблія вярнулася зусім нядаўна: яна стала добрым падарункам на 50-гадовы юбілей ЦНБ НАН Беларусі ад Бібліятэкі імя Урублеўскіх Акадэміі навук Літвы. На жаль, некаторыя старонкі не захаваліся, але іх узнавілі ў лічбаванай копіі, таксама прапанаванай наведвальнікам у межах экспазіцыі. Адметна, што на юбілейнай выстаўцы можна не толькі пабачыць Брэсцкую Біблію, але і пазнаёміцца з лёсам кнігі, прачытаць гісторыю яе стварэння і ўпэўніцца ў каштоўнасці гэтага выдання для беларусаў.

**Дар'я ЧАРНЯЎСКАЯ,**
**фота аўтара**

Дар'я Чарняўская. Торт для Бібліі